названные причины являются серьезным препятствием в развитии новых технологий в промышленности Беларуси.

Основной причиной, сдерживающей развитие инноваций, является недостаток финансовых ресурсов. Финансовая поддержка государства важна, что подтверждается опытом послевоенного развития Юго-Восточной Азии на рынках программного обеспечения и биотехнологии в Сингапуре, персональных компьютеров и микропроцессоров в Малайзии и на Тайване, бытовой электроники в Южной Корее. Однако не менее важно найти пути привлечения свободных финансовых средств или привлечь к сотрудничеству тех, кто ими владеет.

На наш взгляд, и другие вышеперечисленные причины сдерживают инновации. Поиск путей их решения предполагает изменение стереотипа мышления эпохи "фабричных труб". Сегодня мы видим по опыту развитых стран, что производственная сфера теряет приоритетность, уступая ее инновационной индустрии. Успех современных инновационных организаций зависит от таких качеств руководителя, как гибкость, изобретательность и умение мобилизовать усилия коллектива в достижении цели. Умение отслеживать и классифицировать бесконечный поток информации для определения самого важного и ценного для организации.

Нужно уметь перераспределять ресурсы из менее ценных сфер в более ценные, прежде всего — из низкоприбыльной деятельности, обладать навыками привлечения людей, способных приносить организации "большие деньги". Требуются новые качества в проведении маркетинговой стратегии продвижения инноваций, понимание того, что является наиболее эффективным. Новое должно быть более продуктивным, чем уже существующее, иначе оно просто не победит.

***Г.П. Бушчык***

БДУ (Мінск)

## МАДЭРНІЗАЦЫЯ ЭКАНОМІКІ БЕЛАРУСІ ПАСЛЯ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ: НЯМЕЦКІЯ РЭПАРАЦЫІ І САЮЗНЫЯ ІНВЕСТЫЦЫІ

Традыцыйна тэрыторыя Беларусі спецыялізавалася на вытворчасці і перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі, істотную ролю адыгрывала лясная гаспадарка. Надзвычай важным для эканомікі было транзітнае становішча беларускіх зямель у цэнтры Еўрапейскага кантынента. Прамысловае развіццё Беларусі ў XIX — пач. XX ст. істотна адставала ад суседніх рэгіёнаў — Цэнтральнай і Паўночна-Заходняй Расіі, Украіны, Польшчы. Тут пазней і больш марудна ў тыя часы ажыццяўляўся прамысловы пераварот, які ў асноўным характарызаваўся прымяненнем паравых машын. Адначасова перадавыя пазіцыі ў

Расійскай імперыі займала беларуская сельская гаспадарка і чыгуначны транспарт, які звязваў Расію з Заходняй Еўропай. Нават у гады савецкай індустрыялізацыі, да Вялікай Айчыннай вайны, у БССР амаль не будаваліся буйныя прадпрыемствы, не было ваенных заводаў, мадэрнізаваліся ў асноўным традыцыйныя галіны вытворчасці — лёгкая, харчовая, лясная прамысловасць.

Карэнным чынам змянілася сітуацыя пасля вызвалення Беларусі ад фашыстаў і заканчэння другой сусветнай вайны. БССР страціла 10 338 прамысловых прадпрыемстваў (больш за 1/3 усёй колькасці знішчаных у СССР). У 1945 г. выраблялася толькі 20 % прамысловай прадукцыі ад ўзроўню 1940 г. З 1945 г. стратэгіяй савецкага ўрада стала пабудова на тэрыторыі Беларусі моцнай высокатэхналагічнай па тым часе прамысловай базы машынабудавання, якая забяспечвала б асобнымі відамі прадукцыі не толькі саюзныя рэспублікі, але з часам і іншыя сацыялістычныя краіны. На тэрыторыі Беларусі пачалося ўзвядзенне таких прамысловых гігантаў, як трактарны, аўтамабільны, веласіпедны заводы, аднаўленне на новай тэхнічнай аснове даваенных прадпрыемстваў.

Рашэнне было прынята з улікам таго, што Беларусь атрымала права на германскія рэпарацыі, што былі вызначаны ў 1945 г. на Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцыях саюзнікаў па антыгітлераўскай кааліцыі. Беларусі, якая ацаніла свае страты ў 15 млрд дол., згадзілася, як і астатнія краіны, зменшыць свае прэтэнзіі ў 10 разоў, прызначаліся рэпарацыі на суму 1,5 млрд дол. Рэпарацыі былі справядлівай і частковай кампенсацыяй за тыя знішчэнні, што выпалі на долю нашай Радзімы. У кошт рэпарацый у Беларусь з Германіі паступалі харчовыя прадукты, спажывецкія тавары, жывёла. Аднак найбольш важнымі для будучага развіцця рэспублікі былі пастаўкі нямецкага рэпарацыйнага абсталявання для прамысловых прадпрыемстваў. У кошт рэпарацый з Германіі ў БССР было вывезена 182 прадпрыемствы. Толькі да пачатку 1947 г. 150 мінскіх прадпрыемстваў і арганізацый атрымалі 5666 вагонаў з абсталяваннем на суму 115 млн р., у тым ліку Мінскі аўтазавод — каля тысячы вагонаў на суму амаль 20 млн р. Усяго ў 1945—1946 гг. прадпрыемствы і арганізацыі Беларусі атрымалі 37,4 тыс. вагонаў рэпарацыйных паставак з Германіі.

У Германіі ў першую чаргу дэманціраваліся ваенныя прадпрыемствы з мэтаю яе дэмілітарызацыі, якія, натуральна, былі найбольш тэхнічна перадавымі. На грамадзянскіх прадпрыемствах звычайна ў кошт рэпарацый канфіскавалася палова абсталявання, каб астатняе працавала на патрэбы нямецкага насельніцтва, а таксама каб Германія мела магчымасць выплачваць рэпарацыі прадукцыяй. Такім чынам, рэпарацыйныя пастаўкі былі рознай якасці і зместу, але атрыманне даволі перадавога прамысловага нямецкага абсталявання спрыяла стварэнню на тэрыторыі БССР перадавога па тым часе прамысловага комплексу, карэннай мадэрнізацыі вытворчасці.

Пагадненнямі аб рэпарацыях прадугледжвалася таксама выкарыстанне германскай рабочай сілы. Колькасць ваеннапалонных і інтэрніраваных у рэспубліцы не была пастаяннай, найбольш іх налічвалася ў 1946 г. — 103 тыс. чалавек. Адначасова Беларусі была аказана братняя дапамога саюзных рэспублік і найперш — РСФСР. Найбольшае значэнне для пабудовы якасна новай прамысловасці мела саюзнае фінансаванне. Будаўніцтва ўсіх буйных прадпрыемстваў фінансавалася з саюзнага бюджэту. Аб'ём капітальных укладанняў у аднаўленне народнай гаспадаркі ў 1946—1950 гг. дасягнуў 742 млн р. (у цэнах 1955 г.), што на 16 % перавысіла капітальныя ўкладанні за тры перадваенныя пяцігодкі. Больш за трэцюю частку гэтых укладанняў было выкарыстана для прамысловага будаўніцтва.

Як сведчыць статыстыка, у 1950 г. БССР не толькі аднавіла, але і перавысіла на 15 % даваенны выпуск прамысловай прадукцыі. Узровень 1945 г. быў перавышаны ў 5,8 раза. Прадукцыя машынабудавання ў 1950 г. у 8,9 раза перавысіла ўзровень 1945 г. і ў 3,4 раза — 1940 г., заняла лідзіруючыя пазіцыі ў прамысловасці.

Такім чынам, за пасляваенную пяцігодку ў Беларусі была ажыццеўлена мадэрнізацыя індустрыі, карэнным чынам змянілася структура прамысловасці, рэзка ўзрос аб'ём выпускаемай прадукцыі. Як сведчаць факты, важнейшымі крыніцамі пасляваеннай мадэрнізацыі сталі саюзныя капіталаўкладанні і пастаўка рэпарацыйнага нямецкага абсталявання. Атрыманыя Беларуссю рэпарацыі былі справядлівай і частковай кампенсацыяй за прынесены агрэсарам урон. Вядучай галіною беларускай індустрыі стала машынабудаванне, пачала развівацца ваенная вытворчасць. Выкарыстанне параўнальна высокатэхналагічнага нямецкага абсталявання стварала падмурак для пераўтварэння Беларусі ў адзін з найбольш прамыслова развітых рэгіёнаў СССР.

***В.Н. Валаханович***

БГЭУ (Минск)

## СТИМУЛИРОВАНИЕ ИНВЕСТИЦИЙ В РЕСПУБЛИКУ БЕЛАРУСЬ

Проблемы структурной перестройки народнохозяйственного комплекса Республики Беларусь требует привлечения иностранных инвестиций, создания механизмов и структур, присущих рыночным отношениям. Для решения этих проблем большое значение имеет создание свободных экономических зон (СЭЗ) на территории Беларуси. Именно эти зоны, с их льготным порядком функционирования, способны привлечь иностранные инвестиции в экономику страны, стимулировать новейшие достижения науки и техники, либерализовать и активизировать внешнеэкономическую деятельность.

Свободные экономические зоны для правовой системы Республики Беларусь — новое явление. Однако создание и их развитие есть одно из